

# Бібліятэкі ўсіх сістэм і ведамстваў, яднайцеся!

***Пад такім нефармальным дэвізам 25-27 кастрычніка Фундаментальная бібліятэка Беларускага дзяржаўнага універсітэта разам з Міністэрствам культуры, Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і Беларускай бібліятэчнай асацыяцыяй правялі Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю "Роля бібліятэк і інфармацыі ва ўстойлівым развіцці грамадства".***

У канферэнцыі прынялі ўдзел каля 300 чалавек, у тым ліку прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, вядучыя спецыялісты Нацыянальнай, рэспубліканскіх, галіновых, абласных і публічных бібліятЭк з усіх рэгіёнаў нашай краіны, а таксама ганаровыя госці з Расіі, Украіны, Літвы і ЗША. Былі абмеркаваны мэты і задачы бібліятэк як сацыякультурных і інфармацыйных цэнтраў грамадства ў забеспячэнні яго ўстойлівага развіцця, далейшыя шляхі ўдасканальвання інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва Беларусі на аснове выкарыстання сучасных камп'ютэрных і тэлекамунікацыйных тэхналогій, актуальныя тэндэнцыі развіцця бібліятэчнай справы, узмацненне ролі бібліятэк як інстытутаў нацыянальнай культуры і нацыянальнай памяці. Асобнымі пунктамі ў праграме форуму сталі справаздачна-выбарная канферэнцыя Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі (дзе быў абраны новы яе старшыня — дырэктар Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С.Пушкіна Наталля Чуева) і фокусны семінар "Нацыянальная бібліятэка Беларусі як рэспубліканскі інфармацыйны цэнтр" (дзе са сваімі дакладамі выступілі супрацоўнікі НББ, падрабязна пазнаёміўшы слухачоў са станам і перспектывамі дзейнасці галоўнай кніжнай скарбніцы краіны па ўсіх кірунках).

Нягледзячы на вельмі стракаты спектр вынесеных на абмеркаванне праблем, пераважная большасць выступоўцаў адзначала ўсё-такі адну галоўную: недастатковы ўзровень скаапераванасці розных бібліятэк, а ў выніку — перш за ўсё эканамічны пралік у справе назапашвання фондаў, апрацоўкі інфармацыйных рэсурсаў, інтэграцыі ў сусветную бібліятэчную прастору і інш. Так, многія бібліятэкі пачалі актыўна прыўносіць у сваю дзейнасць новыя інфармацыйныя тэхналогіі, і тым не менш пакуль што кожная бібліятэка выбірае свой шлях развіцця, сваё праграмнае забеспячэнне і ўласныя падыходы да новых інфармацыйных выклікаў. Таму галоўнай рэкамендацыяй, вынесенай у рэзалюцыю канферэнцыі, стала неабходнасць выпрацоўкі адзіных падыходаў да кааперацыі паміж бібліятэкамі. Самадастатковасць — гэта добрая рэч, але да пэўнай мяжы. Ёсць агульныя пытанні, якія можна паспяхова вырашаць агульнымі намаганнямі, не губляючы пры гэтым індывідуальнасці, было адзначана на канферэнцыі. Прынцыповыя ж спадзяванні ў гэтым сэнсе бібліятэкары ўскладаюць перш за ўсё на Беларускую бібліятэчную асацыяцыю, якая магла б вынесці дэвізам на свой "сцяг": "Бібліятэкі ўсіх сістэм і ведамстваў, яднайцеся!",

Як ні дзіўна, праблемы нашых бібліятэкараў аказаліся добра бачнымі не толькі ім самім, але і запрошаным замежным спецыялістам. У прыватнасці, экс-прэзідэнт Амерыканскай бібліятэчнай асацыяцыі (гісторыя якой налічвае ўжо каля 130 гадоў!) Фрыдман Морыс, выступаючы перад удзельнікамі канферэнцыі на заключным пасяджэнні, заўважыў, што па ўзроўні развіцця каталагізацыі і па ўзроўні скаапераванасці беларускія бібліятэкі сёння знаходзяцца прыблізна на такой стадыі, на якой амерыканскія былі некалькі гадоў назад. Як адзначыў шаноўны госць, беларусам лягчэй хаця б у тым сэнсе, што яны могуць вучыцца на памылках, якія мусілі прайсці ў свой час тыя ж амерыканцы, каб урэшце ўсё-такі вярнуцца да гэтага: у раз'яднанасці бібліятэкам сёння паспяхова развівацца немагчыма.

**Мікола ЧЭМЕР.**